





Лепшая зборшчыца клубнікі Таццяна Бяліцкая.

*ФОТАРЭПАРТАЖ*

# Фабрыка гародніны

На прылаўках магазінаў Салігорска і іншых гарадоў рэспублікі штодзённа паяўляюцца свежыя гуркі, капуста, рэдыс, шчаўе, цыбуля, клубніка і іншая гародніна, вырашчаная ў саўгасе «Свабода». На вырошчванні гародніны працуюць старанныя людзі. Паглядзіце на верхні здымак справа. Гэта Параска Каспяровіч, Алена Трухан і Анастасія Крывуля з выбранымі гуркамі. Яны штодзённа выбіраюць сотні кілаграмаў гуркоў. А побач звеннявыя агародняй брыгады Антаніна Ігнатовіч і Ніна Усовіч задаволена глядзяць услед ад'ехаўшым машынам, даверху нагружаным гароднінай.